# Сусвет пад назвай Беларусь.

Свая зямля – вось што аснова!
Якуб Колас




Беларусь… Дзіўная краіна са сваім цікавым мінулым, поўным легенд і паданняў, багатай культурнай спадчынай. Большая частка прыроды нашай краіны захавалася практычна ў некранутым выглядзе. Мы нават і самі часам не разумеем, як нам пашанцавала мець на сваёй тэрыторыі ўсё гэта багацце.



На прыгажосць роднага краю творчыя людзі маюць свой погляд і адлюстроўваюць яго своеасабліва. Менавіта з такім чалавекам пашанцавала пазнаёміцца наведвальнікам аддзялення дзённага знаходжання грамадзян сталага ўзросту цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна пад час мерапрыемства, якое адбылося ў раённым краязнаўчым музеі. Гэты чалавек – Аляксандр Іванавіч Лакотка, архітэктар, доктар архітэктуры, доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат прэміі “За духоўнае адраджэнне”, дырэктар Цэнтра даследванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, аўтар некалькі дзесяткаў манаграфій і соцень навуковых прац. Акрамя гэтага, ён займаецца жывапісам і графікай. Праз свае карціны Аляксандр Іванавіч перадае яркі, маляўнічы каларыт прыроды, абшараў беларускай зямлі пад высокім мірным небам.





Прысутныя з задавальненнем слухалі выступленне аўтара, а яго жонка, Святлана Аляксандраўна, паведаміла пра творчы шлях свайго мужа, а ён складае больш за пяцьдзесят гадоў. Нам пашанцавала ў чарговы раз сустрэцца і пагутарыць з Верай Данілаўнай Міцкевіч, навуковым



супрацоўнікам Цэнтра даследванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, унучкай класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа, а таксама пазнаёміцца з Юрыем Сяргеевічам Івановым, легендарным фотажурналістам і фотамастаком, лаўрэатам усесаюзных і міжнародных конкурсаў, лаўрэатам прэміі Саюза журналістаў Беларусі, лаўрэатам прэміі “Золотая Литера”.



Наведвальнікі цэнтра з цікавасцю знаёміліся з карцінамі мастака, на якіх адлюстравана не толькі каляровая, але і эмацыйная дынаміка пейзажа, аблокі, парывы ветру, сакавітыя колеры, далечы, прасёлачныя



дарогі, блакітныя вочы азёр. У словах падзякі аўтару адзначалася, што ў яго малюнках адчуваецца замілаванасць роднай старонкай і гэтыя вобразы многіх вяртаюць ў маленства, да матулінай хаты, да сваіх каранёў, да роднай зямлі, да той мяжы, адкуль пачынаецца род.

Ніл Гілевіч пісаў: “У глыбінях зямлі нашых душ карані..”. У гэтым мы ўпэўніліся пад час знаёмства з выставай Аляксандра Лакотка “Сусвет пад назвай Беларусь”.

Тэрэса Кошань
спецыяліст па сацыяльнай рабоце
ЦСАН Ашмянскага раёна